**Палтаржыцкая Н.М.**

**ДА ПЫТАННЯ АБ ФАЛЬСІФІКАЦЫІ ДАКУМЕНТАЎ АКТАВЫХ КНІГ У АРХІВЕ МІНСКАГА МАГІСТРАТА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.**

Актавыя кнігі, якія былі створаны ў працэсе дзейнасці органа самакіравання горада – магістрата – з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для вывучэння яго гісторыі. Сфера дзейнасці магістратаў была разнабаковай: тут павінны былі рэгістравацца акты натарыяльнага характару, гаспадарча-фінансавыя адносіны жыхароў горада, адміністрацыйныя стасункі і інш. Усё гэта стварала ўмовы для адлюстравання ў магістрацкіх кнігах розных бакоў жыцця тагачаснага грамадства. Аднак у сярэдзіне XIX ст. магістрат не меў ужо такога важнага статуса ў гарадах, як гэта было раней. Адпаведна, дакументы і кнігі, якія былі створаны ў яго канцылярыі знаходзіліся ў кепскім стане, адсутнічаў кантроль цэнтральных улад за іх захаваннем. Многія актавыя кнігі былі расшыты, частка дакументаў страчана ў выніку трымання іх у неадпаведных умовах. Дзеючыя архівісты, тлумачачы такі стан архіваў, спасылаліся на сваіх папярэднікаў, перакладаючы віну за недахопы на іх або на наступствы ваенных дзеянняў ці пажараў. Такі стан архіўнай справы і непарадкі ў захаванні дакументаў спрошчалі фальсіфікацыю і падлог дакументаў аб шляхецкім паходжанні [1, с. 211]. Што датычыцца Мінска, шмат дакументаў і магістрацкіх кніг было згублена ў час вайны 1654–1667 гг. [2, с. 140]. Акрамя гэтага, у 1762 г. частка архіва Мінскага магістрата, які знаходзіўся ў камяніцы бурмістра Яна Давіда Шэйбы, страчана ў пажары. У час пажару 30 мая 1835 г у бернардзінскім манастыры кнігі Мінскага магістрата былі выкінутыя з келлі, дзе на той час захоўваліся. Яны доўга заставаліся раскіданымі на зямлі і ў выніку былі часткова знішчаны [3, арк. 405]. Не менш важнай прычынай малой колькасці захаваўшыхся мінскіх магістрацкіх кніг, асабліва за ранні перыяд, з'яўляецца пашкоджанне кніг падчас наладжанага тут працэсу вырабу падробных дакументаў у першай палове XIX ст. У 1851 г. была створана следчая камісія, якая распачала крымінальную справу "Аб беспарадках і злоўжываннях Мінскага гарадавога магістрата" [3, арк. 1]. Аналіз яе матэрыялаў дазваляе даць адказ на некалькі важных пытанняў: колькасны стан комплексу актавых кніг Мінскага магістрата, цэласнасць архіва і ўмовы яго захавання ў сярэдзіне XIX ст.

Падставай для расследавання фактаў злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў архіве Мінскага магістрата стаў данос калежскага рэгістратара Станіслава Аляхновіча. Ён абвінаваціў калежскага асэсара Ігната Немчыновіча фальсіфікатарскай дзейнасці [3, арк. 1–3]. Паводле слоў абвінаваўцы, Немчыновіч меў фальшывыя пячаткі, завяраў імі фальшывыя дакументы і падшываў у магістрацкія кнігі Мінска, да якіх меў службовы доступ [3, арк. 41]. У выніку вобыска ў доме Немчыновічаў следчымі знойдзены 13 старажытных дакументаў, сярод якіх быў рэестр за 1654–1695 гг. [3, арк. 36]. Было ўстаноўлена, што дакументы, якія выдаваў на пасадзе калежскага асэсара І. Немчыновіч, галоўным чынам ішлі ў Дваранскі дэпутатскі сход для пацвярджэння дваранства. Для праверкі выданых копій па загаду мінскага грамадзянскага губернатара была створана спецыяльная камісія ў складзе старшыні палаты Крымінальнага суда А. Маліноўскага і казённых спраў страпчага Ф. Рамішэўскага для правядзення рэвізіі архіва магістрата [3, арк. 139]. Пазней у яе склад былі прызначаны яшчэ перакладчык і два пісары. Чальцам камісіі было даручана праверыць усе магістрацкія кнігі на наяўнасць фальшывых дакументаў, а таксама знайсці, хто выдаваў, каму і для чаго з іх копіі.

Пры першапачатковым аглядзе камісія знайшла архіў Мінскага магістрата ў занядбанні [3, арк. 11–12]. Так, пячаткі архіва аказаліся цэлымі, але дзверы былі не зачынены. Ніхто з апытаных службоўцаў і сакратара так і не змог адказаць, дзе захоўваюцца актавыя кнігі [3, арк. 24]. Пасля таго, як кнігі былі знойдзены, аказалася, што яны бессістэмна раскіданы на падлозе ў вільготным куце разам з іншымі справамі і паперамі. Шмат спарахнелых старажытных дакументаў за канец XVI – пачатак XVII стст. былі вывалены ў кучу на гнілой рагожы [3, арк. 540]. У выніку чальцы камісіі адабралі тыя кнігі і дакументы, якія захаваліся ці захаваліся хаця б часткова (паводле справаздачы палова з іх ад дотыку распалася на часткі). Усе яны былі складзены ў мех і два куфры, пасля чаго планавалася іх перамяшчэнне і правядзенне праверкі на наяўнасць фальшывых дакументаў.

На пачатку перад камісіяй было пастаўлена пытанне, дзе наладзіць сваю працу. Бліжэйшым быў непасрэдна архіўны пакой магістрата, што не задавальняла чальцоў камісіі па некалькіх прычынах. Па-першае, ён прадстаўляў сабой цеснае памяшканне, і вылучыць там месца для камісіі не было нават магчымасці. Па-другое, заняць пакой магістрата камісія не магла, бо тады б яго дзейнасць прыпынілася на некалькі месяцаў, што таксама было непрымальна [3, арк. 251]. Яшчэ адной прычынай, па якой камісія не пажадала пакінуць кнігі ў архіве пад наглядам яго службоўцаў было падазрэнне, што яны могуць знішчыць сляды сваіх злачынстваў. У выніку 9 лістапада 1851 г. архіў Мінскага гарадавога магістрата і архіў Сіроцкага суда былі перавезены [3, арк. 86 адв.]. З ветхага і вільготнага двухпавярховага дома купца 3 гільдзіі Абрама Голдзіна на вуглу вуліц Францішканскай і Захар'еўскай кнігі былі дастаўлены ў трохпавярховы каменны дом дваранiна Роберта Ланеўскага на плошчы Высокага рынка [4, арк. 2 адв.]. Кнігі звалілі ў двух пакоях у кучы, замкнулі і апячаталі, а ключы ад дзвярэй пакінулі бурмістру Марку Шчатніковічу [3, арк. 246].

Толькі праз месяц была распачата праца камісіі, якая 12 снежня 1851 г. узяла на праверку з архіва Мінскага магістрата 161 кнігу. Пры пераглядзе сярод іх былі вылучаны 13 кніг (не актавыя), якія былі вернутыя ў магістрат. У 115 актавых кнігах чальцы камісіі не заўважылі ніякіх падробак, а вось у астатніх 33 знойдзены сумнеўныя дакументы (гл. табліцу ў дадатку). Да кніг быў складзены рэестр з інфармацыяй аб колькасці аркушаў і дакументаў у кожнай, прастаўлена новая нумарацыя дакументаў чорнымі чарніламі, усе без выключэння кнігі былі зноў змацаваныя, пустыя старонкі – перакрэсленыя. Што датычыцца пераплёту, то ў кнігах, дзе ён зусім сапсаваўся, быў зроблены новы ці адрамантаваны (калі была такая магчымасць) стары [3, арк. 178 адв.].

Адначасова з праверкай актавых кніг праходзіла следства па пытанні злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі былых ураднікаў і архівістаў Мінскага магістрата. Асаблівая ўвага надавалася зыходзячым дакументам з магістрата за 1835–1852 гг., каб даведацца, каму і па якой прычыне выдаваліся падложныя дакументы. Для гэтага быў складзены спіс службовых асоб за гэты перыяд, праводзіліся іх допыты і вобыскі [3, арк. 415–416 адв.]. У выніку было ўстаноўлена, што падложныя дакументы ў Мінскім магістраце складаліся для доказу дваранства ці для пошуку свабоды ад прыгоннага права, а таксама для доказу права на валоданне нерухомай маёмасцю. Самая вялікая колькасць дакументаў, паводле заключэння следчых, была створана для доказу дваранства. Паводле зверкі журналаў магістрата, большасць сумнеўных запісаў былі прадстаўлены ў Мінскі дваранскі дэпутатскі збор пераважна ў перыяд 1840–1843 гг. [3, арк. 545] Было высветлена, што фальшывыя дакументы выдаваліся не толькі дваранам Мінскай, але і іншых губерній. Паведамлялася, што ў большай частцы кніг, дзе былі выяўлены падробкі, пашкоджана пячатка, шмат дакументаў вырваны, а на іх месца ўстаўлены ці напісаны на белавых старонках новыя, у некаторых месцах подпісы выпраўленыя [3, арк. 252 адв.]. У суме сумнеўных дакументаў у мінскіх магістрацкіх актавых кнігах камісія налічыла 1716 [3, арк. 543 адв.].

Цікавым з'яўляецца той факт, што былыя службоўцы магістрата (большасць з якіх ледзь змагла напісаць сваё прозвішча) сцвярджалі, што падпісвалі падложныя дакументы нават не ведаючы іх зместу на аснове дакладаў і даведак сакратароў. Тым не менш, у заключэнні камісіі звернута ўвага на тое, што некаторыя з іх усё ж удзельнічалі ў складанні падробак. З-за таго, што фальшывыя дакументы былі напісаныя рознымі почыркамі і часта асобамі, якія не з'яўляліся службоўцамі магістрата, камісія таксама прыйшла да высновы, што існавала асобная група, якая займалася складаннем падробных дакументаў [3, арк. 549 адв.].

Дзейнасць камісій па выяўленню падложных запісаў атрымала негатыўную ацэнку сучаснікаў і гісторыкаў з-за вялікай шкоды, нанесенай у час іх працы з дакументамі. Вельмі пацярпелі актавыя кнігі земскіх, гродскіх судоў, магістратаў канца XVIII ст., дзе фальсіфікаваныя дакументы сустракаюцца ў вялізнай колькасці: нумарацыя і перакрэсленне старонак былі зроблены неахайна і няўважліва, на некаторых перакрэсленых пазней аркушах фальсіфікатары рабілі дапіскі, шнураванне кніг было зроблена вельмі тонкім ваўняным шнурком, які хутка пераціраўся. Некаторыя кнігі былі прашнураваны далёка ад пераплёту і моцна зацягнуты вузлом так, што іх немагчыма было разгарнуць. Акрамя таго, не ўсе чальцы камісій рэальна ўдзельнічалі ў рэвізіі актавых кніг [1, с. 250].

Аднак на прыкладзе камісіі ў Мінску ў 1851 г. можна адначыць, што яе стварэнне выратавала архіў Мінскага магістрата ад канчатковага знішчэння. Пры параўнанні інфармацыі рэестра кніг чальцоў камісіі 1851 г. з вопісам захаваўшыхся на сённяшні дзень кніг гарадскога самакіравання Мінска можна вызначыць, што ўжо ў другой палове XIX ст. дзве самыя раннія кнігі з комплексу адносіліся да другой паловы XVII ст. Комплекс кніг за XVIII–XIX стст. быў перавезены ў больш спрыяльныя ўмовы з вільготнага і ветхага памяшкання, дзякуючы чаму кнігі захаваліся і да гэтага часу знаходзяцца ў фондах НГАБ.


1. Макарэвіч, В. С. Разбор шляхты ў беларускіх губернiях Расійскай імперыі (канец XVIII – XIX ст.) / В. С. Макарэвіч. – Мінск : БДУ, 2018. – 312 с.
2. Палтаржыцкая, Н. М. Да пытання аб лёсе актавых кніг менскага магістрата XVII ст. / Н. М. Палтаржыцкая // Архіварыус : зб. навук. паведамл. і арт. / Дэпартамент па арх. і справаводству М-ва юстыцыі Рэсп. Беларусь, Нац. гіст. арх. Беларусі. – Мінск, 2011. – Вып. 9. – С. 136–141.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). – Ф. 145. Воп. 2. Спр. 350.
4. НГАБ. – Ф. 24. Воп. 1. Спр. 953.


**Рэестр кніг Мінскага магістрата, разгледжаных камісіяй у 1851 г.**

| | Назва кнігі | Колькасць аркушаў | Колькасць дакуменў | Колькасць сумнеўных дакументаў |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Актавая кніга за 1663–1680 | 1244 | 536 | 2 |
| 2 | Актавая кніга за 1720–1733 | 375 | 145 | 43 |
| 3 | Актавая кніга за 1733–1740 | 574 | 272 | 21 |
| 4 | Актавая кніга за 1740–1743 | 710 | 289 | - |
| 5 | Актавая кніга за 1739–1747 | 819 | 301 | - |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6 | Актавая кніга за 1747–1748 | 552 | 233 | 24 |
| 7 | Актавая кніга за 1749–1751 | 781 | 280 | - |
| 8 | Актавая кніга за 1752–1754 | 675 | 297 | 63 |
| 9 | Актавая кніга за 1755–1757 | 663 | 301 | 78 |
| 10 | Актавая кніга за 1758–1759 | 553 | 222 | 17 |
| 11 | Актавая кніга за 1760–1761 | 605 | 310 | 73 |
| 12 | Актавая кніга за 1762–1764 | 736 | 388 | 64 |
| 13 | *Адаслана ў магістрат* | | | |
| 14 | Актавая кніга за 1772–1778 | 425 | 199 | 60 |
| 15 | Актавая кніга за 1778–1783 | 766 | 358 | 163 |
| 16 | Актавая кніга за 1784–1788 | 506 | 390 | 237 |
| 17 | Дзве кнігі (назвы не ўказаны) | 1) 447 2) 728 | 142; 543 | 12; 242 |
| 18 | Актавая кніга за 1797–1817 | 265 | 288 | 200 |
| 19 | *Адаслана ў магістрат* | 397 | 368 | - |
| 20 | Актавая кніга за 1804–1809 | 387 | 250 | 54 |
| 21 | Актавая кніга за студзень 1810 – 19 чэрвеня 1812 | 353 | 198 | 22 |
| 22 | Явачная кніга 1810–1817 | 261 | 167 | 24 |
| 23 | Кніга рашэнняў № 25 1797 – 12 ліпеня 1809 | 307 | 290 | - |
| 24 | Актавая кніга за № 26 1804–1806 | 354 | 343 | 18 |
| 25 | Актавая кніга за № 27 1807–1808 | 605 | 587 | 2 |
| 26 | Актавая кніга за № 28 1810–1812 | 726 | 703 | - |
| 27 | Актавая кніга за № 29 1813–1816 | 598 | 575 | - |
| 28 | Актавая кніга за № 36 (паточная) 1787–1794 | 467 | 447 | - |
| 29 | Пратакол прызнанняў 1674–1680, *адасланы ў магістрат* | | | |
| 30 | Кніга верыцельных пісем 1796 | 63 | 182 | - |
| 31 | Тое ж 1797 | 79 | 183 | - |
| 32 | Тое ж 1798 | 38 | 104 | - |
| 33 | Кніга кантрактаў 1796–1797 | 18 | 23 | - |
| 34 | Явачная кніга 1800 | 54 | 116 | - |
| 35 | Тое ж 1803 | 51 | 119 | - |
| 36 | Тое ж 1805 | 39 | 85 | 1 |
| 37 | Тое ж 1806 | 47 | 94 | - |
| 38 | Тое ж 1810–1812 | 88 | 136 | - |
| 39 | Тое ж 22 красавіка 1813 – 16 жніўня 1814 | 231 | 102 | - |
| 40 | Пратаколы розных тлумачэнняў 1815, *адасланыя ў магістрат* | | | |
| 41 | Явачная кніга 18 жніўня 1816 – 18 верасня 1817 | 76 | 112 | - |
| 42 | Пратакол [...] 1817 | 43 | 168 | - |
| 43 | Кніга паточная 1817–1818 | 296 | 282 | - |
| 44 | (назва не ўказана) | 239 | 152 | - |
| 45 | Явачная кніга 1819 | 176 | 165 | 5 |
| 46 | Кніга паточная 1819 | 166 | 131 | 14 |
| 47 | Явачная кніга 1817–1818 | 124 | 174 | 27 |
| 48 | Кніга “спраў вячыстых” 1819 | 84 | 146 | 9 |
| 40 | Тое ж 1820 | 162 | 159 | - |
| 50 | Кніга явачная 1820 | 100 | 139 | - |
| 51 | Крапасная кніга 10 чэрвеня 1821 – 21 чэрвеня 1822 | 182 | 184 | - |
| 52 | Кніга явачная 22 снежня 1820 – 14 чэрвеня 1822 | 142 | 215 | - |
| 53 | Крапасная кніга 28 ліпеня 1822 – 7 лістапада 1823 | 186 | 182 | - |
| 54 | Тое ж 6 лістапада 1824 – 25 лістапада 1825 | 146 | 158 | - |
| 55 | Кніга явачная 13 лістапада 1823 – 6 чэрвеня 1826 | 92 | 159 | - |
| 56 | Тое ж 15 ліпеня 1822 – 10 лістапада 1823 | 100 | 163 | - |
| 57 | Крапасная кніга 25 лістапада 1825 – 3 студзеня 1827 | 183 | 229 | 1 |
| 58 | Пратакол прызнанняў 1820-1825 | 64 | 297 | - |
| 59 | Кніга явачная 1826 | 113 | 173 | - |
| 60 | Кніга прызнанняў 25 лістапада 1825 – 6 кастрычніка 1827 | 50 | 231 | - |
| 61 | Явачная кніга па 1827 | 82 | 87 | 1 |
| 62 | Крапасная кніга 1827 | 136 | 148 | - |
| 63 | Тое ж 1828 | 69 | 85 | - |
| 64 | (назва не ўказана) | 58 | 68 | - |
| 65 | Кніга явачная 1828 | 127 | 76 | - |
| 66 | Кніга прызнанняў 1 верасня 1828 – 19 красавіка 1829 | 63 | 67 | - |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 67 | Кніга manif. Па 1828 | 46 | 70 | - |
| 68 | Явачная кніга 1829 | 188 | 165 | - |
| 69 | Кніга прызнанняў 1829 | 142 | 131 | 35 |
| 70 | Крапасная кніга 1 верасня – 30 снежня 1830 | 88 | 53 | - |
| 71 | Крапасная кніга за майскую трэць | 85 | 98 | - |
| 72 | Тое ж за студзенскую трэць 1830 | 94 | 98 | - |
| 73 | Крапасная кніга 1830 | 94 | 163 | - |
| 74 | Тое ж 1831 | 89 | 111 | - |
| 75 | Тое ж 11 чэрвеня -30 снежня | 94 | 140 | - |
| 76 | Явачная кніга 1831 | 135 | 136 | - |
| 77 | Крапасная кніга 13 ліпеня –14 лістапада 1832 | 92 | 120 | - |
| 78 | Крапасная кніга 11 лістапада 183 2 – 9 мая 1833 | 102 | 140 | - |
| 79 | Явачная кніга 9 студзеня – 28 кастрычніка 1832 | 114 | 128 | - |
| 80 | Тое ж 28 кастрычніка 1832 – 10 кастрычніка 1833 | 168 | 201 | - |
| 81 | Крапасная кніга 8 мая 1833 – 17 студзеня 1834 | 138 | 189 | - |
| 82 | Явачная кніга 10 лістапада 1833 – 31 снежня 1834 | 225 | 207 | - |
| 83 | Крапасная кніга 1834 | 91 | 87 | - |
| 84 | Явачная кніга па 1834 | 79 | 91 | - |
| 85 | Тое ж 1834 | 77 | 198 | 4 |
| 86 | Крапасная кніга 2 студзеня – 12 снежня 1835 | 59 | 57 | - |
| 87 | Явачная кніга 3 студзеня – 2 ліпеня 1835 | 135 | 169 | - |
| 88 | Явачная кніга 28 ліпеня – 29 кастрычніка 1835 | 112 | 151 | - |
| 89 | Тое ж 11 студзеня – 25 ліпеня 1835 | 22 | 62 | - |
| 90 | Тое ж 30 кастрычніка – 23 снежня 1835 | 41 | 69 | 10 |
| 91 | Тое ж за студзеньскую трэць 1836 | 38 | 28 | - |
| 92 | Крапасная кніга за майскую трэць | 43 | 33 | - |
| 93 | Тое ж за вераснёвую трэць | 40 | 29 | - |
| 94 | Явачная кніга 1836 | 187 | 325 | - |
| 95 | Тое ж 23 верасня 1836 – 17 мая 1837 | 144 | 240 | - |
| 96 | Пратаколы прызнанняў 1836 | 20 | 92 | - |
| 97 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1837 | 16 | 11 | - |
| 98 | Тое ж за майскую трэць | 30 | 27 | - |
| 99 | Тое ж за вераснёўскую трэць | 31 | 28 | - |
| 100 | Явачная кніга 19 мая 1837 – 27 красавіка 1838 | 189 | 314 | - |
| 101 | Пратакол прызнанняў 1837 | 18 | 70 | - |
| 102 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1838 | 26 | 17 | - |
| 103 | Тое ж за майскую трэць 1838 | - | - | - |
| 104 | Тое ж за вераснёўскую трэць 1838 | 30 | 21 | - |
| 105 | Явачная кніга 28 красавіка – 15 снежня 1838 | 146 | 326 | 1 |
| 106 | Пратаколы прызнанняў 1838 | 24 | 145 | - |
| 107 | (назва не ўказана) | 17 | 53 | - |
| 108 | Пераклады 1838 | 4 | 3 | - |
| 109 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1839 | 26 | 28 | - |
| 110 | Тое ж за майскую трэць | 33 | 27 | 1 |
| 111 | Тое ж за вераснёўскую трэць | 37 | 32 | - |
| 112 | Явачная кніга 3 студзеня – 1 снежня 1839 | 192 | 370 | - |
| 113 | Пратакол прызнанняў 1839 | 23 | 89 | - |
| 114 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1840 | 32 | 25 | - |
| 115 | Крапасная кніга за майскую трэць | 48 | 41 | - |
| 116 | Тое ж за вераснёўскую трэць | 46 | 39 | - |
| 117 | Явачная кніга 4 снежня 1839 – 27 жніўня 1840 | 194 | 299 | - |
| 118 | Тое ж 3 верасня – 31 снежня 1840 | 128 | 205 | - |
| 119 | Пратакол прызнанняў 1840 | 20 | 84 | - |
| 120 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1841 | 67 | 48 | - |
| 121 | Тое ж за майскую трэць | 27 | 20 | - |
| 122 | Тое ж за вераснёўскую трэць | 31 | 25 | - |
| 123 | Явачная кніга 2 студзеня – 4 чэрвеня 1841 | 165 | 195 | - |
| 124 | Тое ж 4 чэрвеня – 30 снежня 1841 | 225 | 337 | 2 |
| 125 | Крапасная кніга за студзеньскую трэць 1842 | 26 | 20 | - |
| 126 | Тое ж за майскую трэць | 27 | 15 | - |
| 127 | Тое ж за вераснёўскую трэць | 8 | 6 | - |
| 128 | Явачная кніга 3 студзеня – 22 чэрвеня 1842 | 192 | 270 | - |
| 129 | Тое ж 22 ліпеня – 20 кастрычніка 1842 | 118 | 183 | - |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 130 | Тое ж 21 кастрычніка – 31 снежня 1842 | 102 | 130 | - |
| 131 | Крапасная кніга за студзеньскую і майскую трэць 1843 | 22 | 14 | - |
| 132 | Тое ж 1 верасня – 31 снежня 1843 | 9 | 20 | - |
| 133 | Явачная кніга 4 студзеня – 30 ліпеня 1843 | 118 | 121 | - |
| 134 | Тое ж 29 ліпеня 1844 | 61 | 85 | - |
| 135 | Тое ж 1843 | 26 | 61 | - |
| 136 | Крапасная кніга 25 студзеня – 28 лютага 1844 | 31 | 20 | - |
| 137 | Явачная кніга 7 студзеня – 20 кастрычніка 1844 | 40 | 36 | - |
| 138 | Тое ж 27 красавіка – 19 лістапада 1844 г. | 102 | 111 | - |
| 139 | Тое ж 9 студзеня – 13 ліпеня 1845 | 100 | 71 | - |
| 140 | Тое ж 15 ліпеня – 16 лістапада | 140 | 81 | - |
| 141 | Тое ж 19 лістапада – 31 снежня 1845 | 48 | 30 | - |
| 142 | Тое ж 25 мая – 6 лістапада 1846 | 97 | 138 | - |
| 143 | Тое ж 6 лістапада – 31 снежня 1846 | 58 | 45 | - |
| 144 | Тое ж 3 студзеня – 24 мая 1846 | 108 | 61 | - |
| 145 | Тое ж па 31 ліпеня 1847 | 144 | 115 | - |
| 146 | Тое ж 4 жніўня – 3 студзеня 1848 | 116 | 235 | - |
| 147 | Тое ж 1848 | 209 | 201 | - |
| 148 | Тое ж 1849 | 118 | 117 | - |
| 149 | Тое ж 1850 | 32 | 26 | - |
| 150 | Абвяшчэнні аб згарэўшых дакументах 1763 | 6 | 1 | - |
| 151 | Пратакол унясенняў | 92 | | - |
| | | | | |
| | У суме<br>Заўвагі: у актавай кнізе з 1810 – па 19 ліпеня 1812 […] 22 дакументаў трэба думаць 16-ць. У выніку за вылікам 6-ці дакументаў, […] сумнеўных дакументаў тысяча семсот шаснаццаць. | 26632 | 23378 | 1530 |

**Кароль М.М.**

## БАРАЦЬБА З ЭПІДЭМІЯМІ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў XIX СТ.: ПА МАТЭРЫЯЛАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА АРХІВА БЕЛАРУСІ[1]

Халера закранула ўсю тэрыторыю Беларусі і хвалямі праходзіла па беларускіх губернях на працягу ўсяго XIX ст. Найбольш яна лютавала ў 1830, 1848, 1853, 1856, 1860–1870-я, 1893, 1910 гг. Халера належыць да вострых інфекцыйных захворванняў, пры адсутнасці лячэння яна можа скончыцца смяротным вынікам за некалькі гадзін. Але першапачаткова крыніцы яе ўзнікнення і шляхі распаўсюджвання вызначаліся няправільна. Існавала памылковае ўяўленне аб тым, што прычынай хваробы з'яўлялася не бактэрыя віда «Vibrio cholerae», а так званыя «міязмы» – пахі шкоднага паветра балотаў або адкідаў жыццядзейнасці чалавека. Узровень прафілактычных мер адпавядаў тагачасным уяўленням і ўзроўню медыцыны[2].

Мясцовамі органамі ўлады ажыццяўляліся мерапрыемствы па прадухіленні распаўсюджання халеры. Рабілася захады, каб зменшыць магчымасць кантактаў з заражанымі асобамі: закрыццё школ і адпраўка вучняў на канікулы, адмена масавых мерапрыемстваў, абавязковай з'яўлялася ізаляцыя хворых і памерлых, ствараліся заставы для спынення і праверкі суднаў, якія накіроўваліся з небяспечных у эпідэмічным плане месцаў. У мястэчку Ула Віцебскай губерні ў 1831 г. падчас эпідэміі халеры была арганізавана абсервацыйная застава [2, арк. 2]·

У канцы XIX ст. пасля адкрыцця французскага хіміка Луі Пастэра, які даказаў сувязь паміж хваробай і мікробамі, стала зразумелым, што халеру выклікае брудная вада. Пачалі друкавацца і распаўсюджвацца сярод насельніцтва новыя правілы, якія акрэслівалі тое, як засцерагчыся ад хваробы.

Для барацьбы з халерай і іншымі захворваннямі ў 1852 г. былі ўтвораны губернскія камітэты грамадскага (народнага) здароўя. У склад камітэтаў уваходзілі губернскі і павятовы маршалкі дваранства, кіраўнік Палаты дзяржаўных маёмасцей, інспектар губернскай урачэбнай управы, старшы ветэрынарны ўрач, паліцмайстар (або гараднічы), гарадскі галава, прадстаўнік духавенства. Яны функцыянавалі да 1865 г., затым, з улікам паляпшэння эпідэмічнай сітуацыі, іх функцыі былі перададзены урачэбным аддзелам губернскіх праўленняў.

Прасочым супрацьэпідэмічныя, санітарныя і гігіенічныя мерапрыемствы, якія прымаліся ў гэты час на прыкладзе з халерай у павятовым горадзе Лепель і мястэчку Бешанковічы Віцебскай гу-

[1] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД, Грант Г21М-011.